ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 26 (548) | Субота, 1 кастрычніка 1983 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

## ЗАЎТРА — ДЗЕНЬ НАСТАЎНІКА



**Многія выкладчыкі гісторыка-філалагічнага факультэта, сённяшнія старшакурснікі яшчэ і цяпер добра памятаюць Антаніну Бараноўскую. Яна выдатна вучылася, актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці факультэта і універсітэта, выбіралася народным дэпутатам.**

**З 1979 года А. Бараноўская працуе ў гомельскай СШ № 44. Тут пра Антаніну Дзмітраўну гавораць як пра аднаго з найбольш здольных маладых педагогаў. Яна творча рыхтуецца да кожнага ўрока, даходліва выкладае праграмны матэрыял па роднай мове і літаратуры.**

**З першага года педагагічнай працы А. Д. Бараноўская заслужыла любоў і павагу вучняў, аўтарытэт у настаўніцкім калектыве адной з лепшых школ нашага горада.**

## ЛЮДЗІ ВЫСОКАГА ПРЫЗВАННЯ

Дзень настаўніка — сапраўды ўсенароднае свята. Ва ўсіх здзяйсненнях і поспехах, у імклівым нашым узлёце да вяршынь навукі і культуры ёсць вялікая доля працы народных настаўнікаў, савецкай школы, якая выхавала ідэйна сталых, адданых справе партыі, высокаадукаваных людзей.

Біяграфія савецкага настаўніцтва — гэта часцінка біяграфіі ўсяго нашага народа. У цяжкія гады калектывізацыі, у агнявых бітвах Вялікай Айчыннай вайны, на цаліне і на БАМе — усюды пакінуў часцінку свайго сэрца і свайго розуму народны настаўнік. Ёсць у савецкіх настаўнікаў і свае асаблівыя памятныя вехі. Размова ідзе аб ліквідацыі непісьменнасці, пачатковым, сямігадовым і васьмігадовым усенавучы і, нарэшце, такі важны рубеж, як завяршэнне пераходу да абавязковай усеагульнай сярэдняй адукацыі.

Школьны настаўнік штодзённа адчувае сябе правадніком ідэй партыі, які нясе вялікую адказнасць за выхаванасць юных у духу беззапаветнай адданасці камуністычным ідэалам, сацыялістычнай Радзіме. Праўдзівае і даходлівае слова настаўніка, яго глыбокае ідэйнае ўздзеянне з'яўляюцца надзейным заслонам супраць спроб буржуазных сродкаў прапаганды ачарніць савецкі лад жыцця, пасеяць у розумах нашай юнай змены насенне ідывідуалізму, нацыяналізму і скептыцызму.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад праяўляюць пастаянныя клопаты аб народных настаўніках. Разам з тым наша грамадства прад'яўляе сёння абгрунтавана ўзрослыя патрабаванні да працы настаўніка, чакае ад яго вялікай мэтанакіраванасці і настойлівасці ў перадоленні недахопаў, якія ёсць у навучанні і выхаванні моладзі. Грамадства зацікаўлена ў далейшым павышэнні прафесіянальнага ўзроўню народнага настаўніка, у высокім аўтарытэце настаўніцкай прафесіі. Нярэдка, на жаль, можна чуць размову аб тым, што настаўніцкая прафесія становіцца менш прэстыжнай па прычыне сваёй масавасці. Так, гэта правільна, настаўнік у нашай краіне — прафесія масавая, і можна толькі радавацца, што колькасць народных настаўнікаў у нашай краіне наблізілася да трох мільёнаў чалавек. Пытанне аб прэстыжы прафесіі настаўніка ўзнікае не таму, што педагогаў многа: колькі б іх не было ў краіне ў цэлым, для школьнікаў і іх бацькоў гэта не мае значэнне. Яны перш за ўсё цэняць у сваіх настаўніках эрудыцыю і культуру, любоў да дзяцей, душэўную чысціню і высакароднасць, мудрую цярплівасць і маральны прыклад.

З пачуццём высокай адказнасці, у атмасферы няспыннага творчага пошуку савецкія настаўнікі працуюць над выкананнем рашэнняў XXVI з'езда партыі ў галіне народнай адукацыі. Іх галоўныя намаганні сканцэнтраваны на тым, каб павысіць якасць навучання, працоўнага і маральнага выхавання, умацаваць сувязь навучання з жыццём, палепшыць падрыхтоўку да грамадска - карыснай працы падрастаючых пакаленняў, якія далей панясуць эстафету камуністычнага будаўніцтва.

Дзейсным стымулам у дасягненні новых поспехаў у народнай адукацыі сталі для ўсіх педагогаў рашэнні чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС, палажэнні і вывады прамовы на гэтым Пленуме Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Ю. У. Андропава аб далейшым умацаванні партыйнай, дзяржаўнай, працоўнай і выканаўчай дысцыпліны, аб павышэнні ўзроўню ідэйна-выхаваўчай работы.

Рашэнні партыі і ўрада з'яўляюцца баявой праграмай дзеянняў і для больш як стотысячнага атрада беларускіх педагогаў у навучанні і камуністычным выхаванні падрастаючага пакалення. У нашай рэспубліцы, як і па ўсёй краіне ў цэлым, у асноўным паспяхова завершан пераход да абавязковай сярэдняй адукацыі. Амаль мільён 374 тысячы навучэнцаў займаюцца ў 6.222 агульнаадукацыйных школах. Вялікая ўвага надаецца ў рэспубліцы падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў для народнай асветы.

Сапраўднай кузняй педагагічных кадраў для школ Гомельскай вобласці і суседніх з ёй абласцей з'яўляецца наш універсітэт. На яго факультэтах вучацца будучыя настаўнікі гісторыі, рускай і беларускай моў і літаратур, біялогіі і хіміі, фізікі, матэматыкі, фізічнай культуры. Студэнты, якія рашылі прысвяціць сябе адной з самых гуманных прафесій у свеце, авалодваюць глыбокімі ведамі па спецыяльных і псіхолага-педагагічных дысцыплінах. Заняткі з імі праводзяць вядомыя вучоныя, высокакваліфікаваныя педагогі, якія маюць вялікі вопыт работы і ў школе, і ў ВНУ. У прыватнасці, лекцыі па педагогіцы чытае ім член-карэспандэнт АПН СССР, доктар педагагічных навук, прафесар І. Ф. Харламаў, заняткі па методыцы выкладання матэматыкі праводзіць дацэнт А. Н. Бекарэвіч, лекцыі па псіхалогіі чытаюць дацэнты Н. І. Мурачкоўскі і Г. Г. Гусева і інш. На ўсіх факультэтах, дзе праходзяць падрыхтоўку будучыя настаўнікі, уведзен спецыяльны семінар «Выхаваўчая работа класнага кіраўніка з вучнёўскім калектывам». Многія студэнты пішуць навуковыя і дыпломныя работы па педагогіцы і псіхалогіі.

Удасканальваецца і практычная падрыхтоўка студэнтаў — будучых настаўнікаў. Усе яны праходзяць педагагічную практыку ў школах, піянерскіх лагерах, у дзіцячых пакоях пры домакіраўніцтвах. У працэсе педагагічнай практыкі ў школе студэнты-выпускнікі паглыбляюць свае тэарэтычныя веды, набываюць вопыт самастойнай работы.

Можна з упэўненасцю сказаць, што выпускнікі нашага універсітэта паспяхова спраўляюцца з важнымі і адказнымі задачамі па камуністычнаму выхаванню падрастаючых пакаленняў. Адно з пераканаўчых сведчанняў гэтаму — добрыя водзывы аб нашых выпускніках настаўнікаў і кіраўніцтва школ, дзе яны працуюць. Павагу і аўтарытэт сярод калег па рабоце і вучняў заслужылі Тамара Ярмілава, Людміла Кобелева, Людміла Сёмкіна, Анатоль Севасцьянаў, Леанід Шапавалаў, Вольга Казлова, Тамара Ясючэня і многія іншыя нашы выпускнікі.

Народны настаўнік — гордасць савецкага грамадства, яго вялікая сіла. Шчасце і абавязак савецкага настаўніка — беззапаветнае служэнне справе роднай партыі, натхнёная праца на карысць Радзімы. Савецкія людзі сардэчна віншуюць усіх настаўнікаў у дзень іх прафесійнага свята і жадаюць ім новых вялікіх поспехаў у навучанні і камуністычным выхаванні падрастаючых пакаленняў.

**Л. СЕЧКА, Ф. КАДОЛ,**
**дацэнты кафедры педагогікі і псіхалогіі.**



**У пяцікурснікаў гісторыка-філалагічнага факультэта ідзе педагагічная практыка. Яна як бы падсумоўвае набытыя студэнтамі веды за чатыры гады вучобы і адначасова вызначае іх навыкі і здольнасць да самастойнай педагагічнай працы.**

**З упэўненасцю можна сказаць, што не памылілася ў выбары сваёй прафесіі Галіна Юдзянкова — адна з лепшых студэнтак, староста групы БР-52. Цяпер яна праходзіць педагагічную практыку у гомельскай СШ № 8.**

**НА ЗДЫМКУ: Г. Юдзянкова вядзе ўрок беларускай мовы ў 6 «ж» класе.**

Фота К. ДЗМІТЭРКІ.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**У кастрычніку пачынаюцца заняткі у сістэме паліт-асветы. Мільёны савецкіх людзей ўключацца ў вывучэнне палітычных ведаў.**

**У нашым універсітэце першыя заняткі новага навучальнага года адбудуцца 3 кастрычніка 1983 г. у актавай зале. Перад слухачамі і прапагандыстамі ўсіх форм марксісцка-ленінскай адукацыі з лекцыяй «Ідэалагічная работа — справа усёй партыі, кожнага камуніста» выступіць дацэнт кафедры гісторыі КПСС І. Ф. Эсмантовіч.**

Пачатак заняткаў — у 14 гадзін.

ПАРТКОМ.

## *ВІНШУЕМ!*

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры МАСЛЮКОВА Віктара Фёдаравіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.

# АБМЕРКАВАЛІ КАМУНІСТЫ

На гэтым тыдні ў сераду адбыўся чарговы партыйны сход на гісторыка-філалагічным факультэце. На яго парадак было вынесена пытанне аб павышэнні ролі партарганізацыі гістфіла ў ажыццяўленні рашэнняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС. Са змястоўным дакладам выступіла дацэнт кафедры рускай літаратуры А. К. Няронская.

Даклад выклікаў ажыўленыя спрэчкі. У яго абмеркаванні прынялі ўдзел загадчык кафедры беларускай мовы У. В. Анічэнка, дацэнт кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі Л. М. Гаранін, дацэнт кафедры рускай літаратуры М. В. Родчанка, загадчык кафедры англійскай мовы І. М. Акулаў, ветэран партыі дацэнт Т. С. Янкова, дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта Т. І. Язэпава, сакратар парткома М. І. Старавойтаў, сакратар партбюро гістфіла М. Ф. Гуліцкі.

Праз усе выступленні камуністаў стрыжнявой прайшла думка аб карэнным паляпшэнні усёй ідэалагічнай работы ў святле патрабаванняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС, адшуканні і ўкараненні новых і эфектыўных яе форм і метадаў. Падкрэслівалася жыццёвая неабходнасць усемагчымага выкарыстання багатага вопыту камуністаў-ветэранаў.

Па абмеркаванаму пытанню на сходзе прынята адпаведная разгорнутая пастанова.

* * *

На матэматычным факультэце па дакладу сакратара партбюро Л. Я. Палякова абмеркаваны задачы калектыву факультэта, якія вынікаюць з рашэнняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС і выступлення на ім Генеральнага сакратара ЦК КПСС Ю. У. Андропава.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел 9 камуністаў. Усе выступленні насілі дзелавы і прадметны характар. Асноўная ўвага звярталася на паўнейшае выкарыстанне рэзерваў і магчымасцей кожнай кафедры, якаснае паляпшэнне падрыхтоўкі спецыялістаў з тым, каб на іх быў шырокі попыт, на паглыбленне навуковых распрацовак.

З аналагічнай павесткай дня адбыліся партыйныя сходы і ў некаторых іншых пярвічных партыйных арганізацыях ГДУ.

* * *

Камуністы эканамічнага факультэта на сваім чарговым сходзе вялі размову аб укараненні тэхнічных сродкаў у вучэбны працэс. З дакладам выступіў загадчык кафедры тэхнічных сродкаў апрацоўкі эканамічнай інфармацыі дацэнт А. І. Іванюк. Ён, а таксама выступіўшыя на сходзе дэкан факультэта У. Д. Арэшчанка, загадчык кафедры палітэканоміі У. Ф. Бондараў, загадчык кафедры галіновых эканомік А. В. Няbelieveраў, загадчыца лабараторый М. У. Бібікава і іншыя прамоўцы гаварылі не толькі аб тым, што ўжо зроблена па ўкараненню тэхнічных сродкаў у вучэбны працэс і яго ўдасканальванню, але і наяўных у гэтай справе недахопах.

На партыйным сходзе метадычнай камісіі факультэта даручана распрацаваць план мерапрыемстваў па лепшаму выкарыстанню тэхнічных сродкаў пры падрыхтоўцы спецыялістаў эканамічнага профілю.

(Наш кар.).

*Рэха працоўнага семестра — 83*

# СТАЛІ СЯБРАМІ

**ГЭТЫ РАСКАЗ — АБ СУМЕСНАЙ РАБОТЕ СТУДЭНЦКІХ БУДАЎНІЧЫХ АТРАДАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА І КРАІН САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА НА ЗЯМЛІ БРАТНЯЙ ЧЭХАСЛАВАКІІ.**

Лета... З гэтым словам звязана вельмі многае. Гэта і радасць перамог і горыч няўдач у мінулай сесіі, яркае сонца, і турысцкія паходы, новыя адкрыцці, знаёмствы, новыя ўражанні...

Але сёння немагчыма ўявіць сабе студэнцкае жыццё без працоўнага лета, без працы з таварышамі, без канцэртаў, вячэрняга кастра і песень аб студэнцкай планеце «Цаліна».

З надыходам летніх канікулаў рабят у зялёных куртках з эмблемай СБА можна сустрэць ва ўсіх кутках нашай краіны, і не толькі на Радзіме. Там, дзе цяжка, дзе патрэбны рабочыя рукі, запал, энтузіязм маладых, — там працуюць студэнты.

**Мой друг, готов ли твой**
**рюкзак?**
**Гудок раздался над вокзалом.**
**Другие начинали так —**
**Теперь и нам пора настала...**

Раздаўся гудок... І вось ззаду ўжо апошнія кварталы Мінска — сталіцы нашай рэспублікі. Цягнік імчыць нас да горада, у якім давядзецца жыць і працаваць, сталіцы Паўднёвай Чэхіі — Чэске-Будзеёвіцы.

Тут, у горадзе-пабраціме роднага Гомеля для многіх байцоў нашага атрада праходзіла працоўнае студэнцкае лета-83.

Даўно склалася традыцыя паміж ГДУ і Вышэйшай сельскагаспадарчай школай у г. Чэске-Будзеёвіцы: абменьвацца студэнцкімі будаўнічымі атрадамі. А ў гэтым годзе працоўную братнюю эстафету пашчасціла працягваць нам — студэнтам матэматычнага факультэта. У адзінаццаты раз рабят у будатрадаўскіх куртках з эмблемамі ГДУ прымалі на чэшскай зямлі.

Нам цікава было пазнаёміцца з гісторыяй Вышэйшай сельскагаспадарчай школы, адзін з факультэтаў якой — вытворча-эканамічны, размяшчаецца ў г. Чэске-Будзеёвіцы. Яе адкрыццё было звязана з хуткім развіццём сацыялістычнай сельскай гаспадаркі ў ЧССР. Асноўнай задачай школы з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй для сельскагаспадарчай вытворчасці.

Тут створаны ўсе ўмовы для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. У наяўнасці — якасныя прыборы і навейшая сельскагаспадарчая тэхніка.

Вытворча-эканамічны факультэт сельскагаспадарчай школы мае ўласны вылічальны цэнтр, вопытны палетак і цяпліцы, а таксама кіруе вучгасам, які мае 10 тыс. гектараў зямлі.

Мэтай школы з'яўляецца падрыхтоўка не толькі інжынераў-эканамістаў, але і жывёлаводаў, раслінаводаў. Дзённае і завочнае навучанне студэнтаў ажыццяўляюць на факультэце больш 90 педагагічных работнікаў. За 23 гады існавання факультэта, яго скончылі 3 тысячы студэнтаў, 20 прац. — завочна.

Вучоба на факультэце працягваецца 4 гады, хаця да апошняга часу тэрмін навучання складаў 5 гадоў. Увесь працэс навучання ажыццяўляецца наступнымі кафедрамі: матэматыкі і статыстыкі, хіміі, сельскагаспадарчых сістэм, раслінаводства і агульнай заатэхнікі, анатоміі і фізіялогіі сельскагаспадарчых жывёлін, спецыяльнасцей заатэхнікі, аховы прыроды і рыбалоўства, сельскагаспадарчай эканомікі, с/г тэхнікі, замежных моў.

У вучэбнай гаспадарцы Вышэйшай сельскагаспадарчай школы і працаваў наш інтэрнацыянальны атрад «Дружба-83». Спачатку частка байцоў дапамагала будаўнікам накрываць дахі жывёлагадоўчых памяшканняў на ферме ў в. Баравіцэ, астатнія — працавалі падсобнымі рабочымі на будаўніцтве кароўніка на 100 галоў у в. Муніцэ, у вучэбнай гаспадарцы Вышэйшай сельскагаспадарчай школы. Работа была рознай: бетанаванне, прыгатаванне раствору, пракладка траншэй і інш. Трэба адзначыць, што ўсе асноўныя работы на будоўлі ў чэшскіх сяброў выконваюць толькі кваліфікаваныя рабочыя. Гэтым і тлумачыцца тое, што мы працавалі толькі на падсобных работах. Таму, на нашу думку, у час падрыхтоўчага перыяду да наступнага працоўнага семестра варта было б арганізаваць у нашым універсітэце вучобу байцоў СБА па набыццю імі будаўнічых спецыяльнасцей. Тады байцы СБА ГДУ маглі б у час працоўнага семестра ў братняй Чэхаславакіі папрацаваць з большай аддачай.

Кожны баец лічыў сваім абавязкам аказаць дапамогу вучгасу ў нарыхтоўцы кармоў. У выхадныя дні з вялікім энтузіязмам, імкненнем зрабіць як мага больш, мы ехалі на поле.

**Сваімі ўражаннямі аб працоўным семестры на зямлі братняй Чэхаславакіі дзеліцца баец інтэратрада «Дружба-83» Уладзімір Зайцаў:**

— Усё, што звязана з працай, запомнілася толькі з лепшага боку. Перш за ўсё — гэта сама арганізацыя працы, цудоўныя адносіны да нас, клопат кіраўнікоў партыйных і камсамольскіх органаў.

На нашым аб'екце ўсталяваліся самыя цёплыя сяброўскія адносіны з чэхамі. Поплеч мы працавалі з чэшскімі рабочымі — гэта яшчэ больш зблізіла нас. Было вельмі цікава размаўляць з імі, бачыць як яны працуюць і паказаць, як працуюць загартаваныя ў будаўнічых атрадах беларускія студэнты. Асабліва спадабалася тое, што ўсе рабочыя добра разумеюць рускую мову, даволі свабодна размаўлялі на ёй. Таму моўнага бар'еру паміж намі не існавала.

Цяжка выдзеліць які-небудзь адзін дзень, што запамятаўся б больш за астатнія. Яркімі, насычанымі былі яны ўсе без выключэння. І кожны з іх прыносіў штосьці новае, адметнае.

Запамяталася і першая сустрэча, спачатку на вакзале ў Празе, а затым вечар-сустрэча з кіраўнікамі факультэта, і вечар дружбы з прадстаўнікамі Вышэйшай сельскагаспадарчай школы, і з рабочымі, студэнтамі іншых краін, якія працавалі і жылі з намі, вечары савецкай песні, дыскатэкі, ускладанне кветак да магіл савецкіх воінаў, паездка па краіне і многае, многае іншае. Вельмі цікавым быў дзень, калі ў в. Лгеніцэ сабраліся на злёт усе атрады, якія працавалі ў Паўднёва-Чэшскай вобласці. Пасля адкрыцця фестывалю былі арганізаваны спартыўныя спаборніцтвы па футболу і валейболу. У іх прымалі ўдзел каманды з Балгарыі, ГДР, Чэхаславакіі і СССР. Мы занялі 1-е месца па валейболу і 2-е — па футболу. Пасля спаборніцтваў адбыліся ўзнагароджанне пераможцаў і выступленне агітбрыгад. Цяжка перадаць пачуцці, якія напоўнілі нашы сэрцы, калі разам з намі «Падмаскоўныя вечары» спявала ўся зала. Мы набылі новых сяброў, пазналі, як жывуць нашы равеснікі ў іншых краінах, расказалі пра СССР, аб нашай ВНУ, будатрадаўскім руху. У ход пайшлі веды беларускай, нямецкай, англійскай мовы. Асабліва здзівіла, што часцей нямецкія студэнты размаўлялі з чэшскімі на рускай мове.

Усюды мы адчувалі цёплыя, сяброўскія адносіны да нашага горада, нашай краіны, любоў да нашых песен.

Вялікае ўражанне пакінула паездка па Чэхаславакіі. Такое знаёмства адкрывае заўсёды тыя старонкі, якіх не ўбачыш ні ў адной кнізе.

Тым студэнтам ГДУ, якія стануць байцамі будатрада «Дружба-84», хачу пажадаць: заўсёды адчувайце, памятайце тое, што вы прадстаўнікі СССР, савецкага студэнцтва. Будзьце прапагандыстамі савецкага ладу жыцця, савецкай культуры. Няхай ваша знаходжанне ў братняй Чэхаславакіі не толькі ўзбагаціць вашы веды, але і ў значнай меры папоўніць веды замежных студэнтаў аб жыцці нашай краіны.

**Людміла ЦАРОВА,**
**камісар інтэратрада «Дружба-83», студэнтка 5-га курса матэматычнага факультэта.**

# ДАСТОЙНА СЛУЖЫЦЕ РАДЗІМЕ

Свяшчэнным абавязкам кожнага савецкага чалавека з'яўляецца абарона сацыялістычнай Радзімы, ахова міру і спакою нашай Айчыны — першай у свеце краіны сацыялізму.

Сёлета рады абаронцаў нашай Радзімы — воінаў Савецкай Арміі — папоўніла вялікая група студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. Сярод іх і 9 юнакоў, якія закончылі першы курс гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ: Валерый Бабовіч, Міхаіл Даўгавечны, Яўген Дулуб, Мікалай Мезга, Валянцін Міхедзька, Андрэй Алесік, Юрый Павадыроў, Сяргей Цімашук і Віктар Шабасовіч.

Паспяхова здадзена вясновая экзаменацыйная сесія. І вось у маляўніча афармленай аўдыторыі сабраліся выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта, каб урачыста павіншаваць прызыўнікоў з адыходам на службу ў рады Савецкай Арміі.

З уступным словам да прысутных звярнулася дэкан факультэта Т. І. Язэпава. Яна падкрэсліла вялікую значнасць у жыцці кожнага маладога чалавека службы ва Узброеных Сілах СССР, пажадала прызыўнікам высока несці званне савецкага салдата і, адслужыўшы належны тэрмін, узмужнелымі вярнуцца ў сцены універсітэта.

Са словамі найлепшых пажаданняў да прызыўнікоў звярнуліся ветэраны Савецкай Арміі намеснік прарэктара па АГЧ універсітэта палкоўнік запасу М. П. Шкарбун, падпалкоўнікі ў адстаўцы начальнік аддзела кадраў П. А. Савінскі, выкладчыкі кафедры грамадзянскай абароны Р. С. Мільчанка, А. А. Баскакаў, маёр у адстаўцы дацэнт кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі Г. С. Еўдакіменка, студэнты-завочнікі ГДУ капітаны М. А. Еруноў, Ю. М. Мамцаў, старшы сяржант І. С. Станько, сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта Анатоль Шэвель, студэнтка Ірына Пракопчык.

**Кожнаму студэнту-прызыўніку** былі ўручаны кветкі і памятныя падарункі. Ад імя прызыўнікоў выступіў Валерый Бабовіч. Ён падзякаваў за цёплыя словы, выказаныя ў іх адрас, запэўніў, што ён і яго таварышы будуць вернымі клятве, дадзенай 1 верасня 1982 года на ўрачыстым пасвячэнні першакурснікаў у студэнты, прыкладуць усе сілы, каб стаць дастойнымі прадаўжальнікамі баявых традыцый сваіх бацькоў і дзядоў.

У знак удзячнасці былі ўручаны кветкі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і ваеннаслужачым, якія прысутнічалі на ўрачыстых провадах прызыўнікоў у рады Савецкай Арміі. Затым усе разам сфатаграфаваліся ля ўваходу ў вучэбны корпус № 1. Так на гісторыка-філалагічным факультэце нарадзілася яшчэ адна слаўная традыцыя, якая будзе садзейнічаць больш паспяховаму патрыятычнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

**І. ЭСМАНТОВІЧ,**
**студэнтка 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**



Гэты здымак, зроблены ў адзін з апошніх чэрвеньскіх дзён, стане адным з самых памятных для студэнтаў гістфіла (на пярэднім плане), прызваных на службу ў рады Савецкай Арміі.

